УДК 811.161.3’373.46:35.077.1«192»

*Л.Р. Белка*

# ФАРМІРАВАННЕ СПРАВАВОДЧАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКУ XX СТ. (НА МАТЭРЫЯЛЕ «ДЗЕЛАВОДА» С. СЕРАДЫ)

Артыкул прысвечаны праблемам гісторыі развіцця і станаўлення справаводчай лексікі. У выніку даследавання аўтарам адзначаецца, што пры перакладзе тэрміналагічнай лексікі сферы справаводства выкарыстоўваліся розныя эквіваленты, у тым ліку дыялектныя, размоўна-гутарковыя словы, новаўтварэнні, інтэрнацыянальная лексіка, а таксама безэквівалентны спосаб перакладу. Прааналізаваны лексічны матэрыял таксама сведчыць аб тым, што працэс інтэрнацыяналізацыі навуковай тэрміналогіі выявіў вялікую ўстойлівасць, а гэта абумоўлена спецыфікай семантыкі іншамоўных слоў.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адзінай дзяржаўнай мовай была прызнана беларуская. Для абазначэння паняццяў новых грамадскіх адносін, побыту, навукі, культуры неабходны былі новыя словы – «спецыяльныя тэрміны – той пласт лексікі, які ў дарэвалюцыйныя гады быў найменш распрацаваны ў беларускай літаратурнай мове, вызначаўся беднасцю, недасканаласцю, штучнасцю, кустаршчынай» [1, с. 268]. Таму паўстала неабходнасць пачынаць вялікую работу «па ўнармаванню лексікі, што знайшло сваё адлюстраванне ў стварэнні слоўнікаў жывой і літаратурнай беларускай мовы і распрацоўцы беларускай навуковай тэрміналогіі» [2, с. 194].

Як вядома, «паслядоўная і мэтанакіраваная праца па стварэнні нацыянальнай навуковай тэрміналогіі пачалася пасля арганізацыі ў лютым 1921 года пры народным камісарыяце асветы ССРБ Навукова-тэрміналагічнай камісіі» [3, с. 3]. Камісія ў сваёй працы стала арыентавацца на лексіку народных гаворак, як больш зразумелую шырокім масам. «Асноўная задача аўтараў тэрміналагічных праектаў заключалася ў тым, каб знайсці ў жывой народнай мове беларускае слова, найбольш адпаведнае рускаму» [2, с. 212]. Аднак на тэрміналогію народная гаворка была бедная. «Усе тэрміналагічныя сродкі народнай гаворкі абмежаваны рамкамі штодзённага побыту» [1, с. 269]. Калі ў мове не знаходзілася адпаведніка, «аўтар або запазычваў яго з іншай мовы, або ўтвараў новае слова пры дапамозе параўнання гэтага слова з другімі, пераважна славянскімі мовамі, дапасоўваючы яго да беларускай мовы» [2, с. 212]. Аднак большасць аўтараў «лічылі наплыў іншаземных слоў з’явай непажаданай» [2, с. 205]. У цэнтры мовазнаўчай практыкі ўкладальнікаў першых тэрміналагічных слоўнікаў стала «задача аддзяліць роднае ад іншародных элементаў у мове» [4, с. 45]. У выніку гэтага часта траплялася няўдалае ўжыванне тэрмінаў, а гэта прыводзіла «да зацямнення іх сэнсу, падмены аднаго паняцця другім, скажэння сутнасці таго ці іншага тэрміна» [2, с. 215]. Відавочна, што ў тэрмінатворчым працэсе немагчыма было абысціся без запазычаных слоў. Лексіка іншамоўнага паходжання характарызавалася «сваёй ізаляванасцю, адсутнасцю асацыятыўных сувязей з іншымі словамі, што ў пэўнай ступені вызначае яе адназначнасць» [5, с. 67]. У адрозненне ад агульнаўжывальных лексем іншамоўнае слова ўжо з’яўляецца гатовым тэрмінам, да таго ж, «калі пэўны іншамоўны тэрмін шырока выкарыстоўваецца ў сферы функцыяніравання і ў блізкароднасных славянскіх мовах, то няма патрэбы ствараць беларускі адпаведнік» [6, с. 122–123].

---

Навуковы кіраўнік – А.А. Станкевіч, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай мовы Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны

Такім чынам, у пачатку ХХ ст. беларуская літаратурная мова знаходзілася ў працэсе станаўлення, а значыць, не заўсёды дзейнічаў прынцып рацыянальнга адбору моўных сродкаў і ў выніку – не ўсё знайшло сваё адлюстраванне ў сучаснай беларускай мове. Нашай задачай з'яўляецца спроба прасачыць гісторыю развіцця і станаўлення справаводчай лексікі на матэрыяле слоўніка канцылярскіх тэрмінаў С. Серады, змешчанага ў выданні «Дзелавод. Узоры афіцыяльных папер, слоўнік тэхнічна-канцылярскіх выразаў і іншыя, патрэбныя ў дзелаводстве веды» С. Серады [7].

«Дзелавод» С. Серады быў выдадзены для супрацоўнікаў канцылярый. У ім змяшчаліся ўзоры афіцыйных папер; выразы, якія ўжываюцца ў афіцыйнай перапісцы; спіс дзяржаўных і грамадскіх устаноў БССР; спіс гарадоў, мястэчак і раённых пунктаў БССР; назвы месяцаў; назвы дзён тыдня; метрычныя меркі; спіс найбольш пашыраных уласных імён; некаторыя правілы беларускага правапісу і кароценькі расійска-беларускі слоўнічак канцылярскіх тэрмінаў.

У працэсе аналізу справаводчай лексікі слоўніка канцылярскіх тэрмінаў «Дзелавода» С. Серады можна прасачыць некаторыя адметнасці станаўлення беларускай тэрміналагічнай лексікі.

Паколькі ў пачатку ХХ ст. яшчэ не ўсталяваліся лексічныя нормы беларускай літаратурнай мовы, пры падборы лексічных адпаведнікаў да рускіх тэрмінаў сферы справаводства часта выкарыстоўваліся дыялектныя словы або ствараліся штучныя наваўтварэнні. Паступова яны былі заменены на іншыя, якія і ўжываюцца ў сучаснай беларускай мове. Прасачыўшы лёс гэтых слоў да сённяшніх дзён, іх можна падзяліць на тры групы:

***1. Лексічныя адпаведнікі рускіх тэрмінаў, прапанаваныя ў слоўніку С. Серады, якія не захаваліся ў беларускай мове*** (делопроизводитель – *дзелавод*, делопроизводство – *дзелаводзтва*, жалобщик – *жалобнік*, исполнитель – *выпаўніцель*, название – *назоў*, населенный – *залюднёны*, опись – *попіс*, планомерный – *пляновы*, посетитель – *наведнік*, приемная – *прымніца*, пробел – *пропуст*, расторжение – *парваньне*, служащий – *служнік*, советник – *райца*, соразмерность – *спамернасьць*, столбец – *шпальта*, счеты – *рахоўніца, лічыдла*, фальсификация – *фальшаваньне*, хранилище – *хавальня*).

***2. Словы, якія звузілі, пашырылі або набылі ў беларускай мове іншае значэнне*** (доверенность – *даверанасьць*, заслушиваць – *слухаць*, обязательный – *абавязковы*, орган – *установа*, переписка – *перапіска*, пометка – *знак*, предъявитель – *паказчык,* приложение – *дадатак*, прописывать – *запісваць*, путеводитель – *дарожнік*, распорядок – *парадак,* пробел – *пропуст*, регламент – *статут*, сослуживец – *супрацоўнік*).

***3. Лексічныя эквіваленты, якія змянілі сваю граматычную форму або набылі іншае словаўтваральнае афармленне*** (возникновение – *вынікненьне*, ежегодный – *штогодны,* законодатель – *законадаўца,* засвидетельствовать – *пасьведчыць,* правовед – *правазнаўца,* работодатель – *работадаўца,* своевременный – *сваячасны*, совпадение – *супадак*, хранитель – *захоўнік*).

Характэрнай рысай лексікі беларускай навуковай мовы пачатку ХХ ст. з'яўлялася варыянтнасць і сінанімічнасць. Пры перакладзе рускіх тэрмінаў на беларускую мову часта выкарыстоўвалася не адно, а некалькі слоў (безработица – *беспрацоўе*, *безрабоцьце*; включительно – *уключна*, *улучна*; включить – *уключыць*, *улучыць*; всеобщий – *усеагульны*, *агульны*; государство – *дзяржава*, *гаспадарства*; делопроизводитель – *дзелавод, справавод*; делопроизводство – *дзелаводзтва, справаводзтва*; деятельность – *дзеяльнасьць, чыннасьць, дзейнасьць, дзеяньне*; заведующий – *загадчык*, *кіраўнік*; надбавка – *надатак*, *надбаўка*; накладная – *праводчая, накладная*; население – *насяленьне, насельніцтва*, *жыхарства*; незаконный – *няпраўны*, *незаконны*; обсуждать – *абмяркоўваць*, *абгаварваць, разважаць*; обсуждение – *абгаворы, разважаньне*, *абмеркаваньне*; оплата – *аплата*,

*выплата, сплачваньне*; переводчик – *перказьнік, перакладчык, тлумач*; прописка – *запіс, прапіска*; рабочий – *рабочы, работнік*; страница – *старонка, балонка*; удостоверять – *сьведчыць, пасьведчыць*; чернила – *атрамант, чарніла*). У сучаснай беларускай мове з прапанаваных варыянтаў захаваўся адзін (*у тэксце ён пазначаны курсівам*), прычым, часцей захоўваліся словы, выкарыстаныя ў слоўніках першымі, а значыць, тыя, што лічыліся асноўнымі, больш пашыранымі.

У якасці варыянтных у пачатку XX ст. часта выкарыстоўваліся эквівалентны і безэквівалентны спосабы перадачы справаводчай лексікі. Аналіз справаводчай лексікі слоўніка «Дзелавода» С. Серады, пры перакладзе якой выкарыстоўвалася безэквівалентная перадача тэрміна, паказвае, што ў асноўным гэта больш датычыць слоў уласнага паходжання, хаця характэрна і для іншамоўных тэрмінаў: рус.: впервые – бел.: *у першы раз;* вышеозначенный – *зазначаны вышэй*; договориться – *дайсьці да згоды*; несвоевременно – *ня ў час*; нетрудоспособность – *няздольнасьць да працы*; обусловливать – *ставіць умовы*; опечатка – *друкарская памылка*; отсутствовать – *быць адсутным*; отчество – *імя па бацьку*; подоходный – *узяты ад прыбытку*; подсудный – *падлягаючы суду*; постановлять – *зрабіць пастанову*; почерк – *характар пісьма*; правонарушение – *парушэньне права*; своевременно – *на часе, у час*; телеграфировать – *падаць тэлеграму*; штаты – *расклад пасадаў.*

У некаторых выпадках пры передачы рускіх тэрмінаў на беларускую мову спалучаюцца безэквівалентны і эквівалентны спосабы: абзац – *новы радок, абзац;* анкета – *анкета, апытальны ліст*; вакансия – *вольная пасада, ваканцыя*; инструктировать – *інструктаваць, наказваць, даваць наказ*; местопребывание – *аселасьць, месца побыту*; наименовать – *надаць імя, найменаваць*; обжаловать – *падаць скаргу, абжаліць*; отсрочить – *адкладаць, адкласьці тэрмін*; переплетать – *рабіць вокладку, апраўляць*; председательствовать – *старшынстваваць, кіраваць сходам*; просрочка – *пропуск тэрміну, прасрочка*; просрочить – *прапусьціць тэрмін, паказаны час, прасрочыць*; реестр – *кніга запісу, рээстр*; советовать – *раіць, даваць параду*; совещаться – *раіцца, мець нараду.*

Як відаць, у якасці лексічных адпаведнікаў пры эквівалентным спосабе перакладу да рускіх тэрмінаў прыводзіліся размоўныя словы (переплетать – *апраўляць*; местопребывание – *аселасьць*), наваўтварэнні (обжаловать – *абжаліць*) або калькі з рускай мовы (наименовать – *найменаваць*; просрочка – *прасрочка*). Амаль усе гэтыя словы ў сучаснай беларускай мове не захаваліся.

У слоўніку С. Серады да асобных рускіх слоў прыводзяцца эквіваленты, якія не ўвайшлі ў беларускую мову і перадаюцца ў ёй безэквівалентным спосабам або з паралельным ужываннем эквівалентнага: *подлежащий* – належны – у слоўніку С. Серады (у сучаснай беларускай мове: які (што) падлягае, падлеглы); *сверхсрочный* – надтэрміновы, пазатэрміновы (звыштэрміновы, вельмі тэрміновы); *служащий* – служнік (які (што) служыць, служачы); *сослуживец* – супрацоўнік (таварыш па службе); *судоустройство* – судоўніцтва (судовы лад); *чрезмерный* – надмерны (празмерны, праз меру вялікі).

Значную ўдзельную вагу ў складзе навуковай тэрміналогіі любой галіны ведаў займае лексіка іншамоўнага паходжання. Не пазбегла такога ўплыву і справаводчая тэрміналогія. І хаця ўкладальнікі першых спецыяльных слоўнікаў імкнуліся замяніць іншамоўныя тэрміны беларускімі словамі, яны не маглі поўнасцю абысціся без іх. Разглядаючы справаводчую лексіку іншамоўнага паходжання адзначанага слоўніка і словы, якія выступаюць у якасці беларускіх эквівалентаў, можна выдзеліць некалькі груп.

***1. Тэрміналагічная лексіка, якая перакладалася толькі іншамоўным словам.*** Да гэтай групы адносяцца словы: автобиография – *аўтобіографія;* автор – *аўтар*; административный – *адміністрацыйны*; администратор – *адміністратар*;

администрация – *адміністрацыя*; адрес – *адрас*; адресат – *адрасат*; аппарат – *апарат*; архив – *архіў*; аттестат – *атэстат*; аттестация – *атэстацыя*; бланк – *блянк*; бухгалтерия – *бухгальтэрыя*; бухгалтер – *бухгальтар*; бюро – *бюро*; виза – *віза*; герб – *гэрб*; графа – *графа*; график – *графік*; декрет – *дэкрэт*; дыплом – *дыплём*; дубликат – *дублікат*; инвентарь – *інвэнтар*; инспектор – *інспэктар*; инспекция – *інспэкцыя*; инструктор – *інструктар*; календарь – *каляндар*; канцелярия – *канцэлярыя*; категория – *катэгорыя*; квалификация – *кваліфікацыя*; кодификация – *кодыфікацыя*; кодификатор – *кодыфікатар*; комиссия – *камісія*; комитет – *камітэт*; конверт – *конвэрт*; контроль – *контроль*; копия – *копія*; ликвидировать – *ліквідаваць*; номер – *нумар*; норма – *норма*; нотариальный – *нотар'яльны, нотарыяльны*; нотариус – *нотарыус*; номеровать – *нумараваць*; нумерация – *нумарацыя*; организация – *арганізацыя*; параграф – *параграф*; паспорт – *пашпарт*; пенсионер – *пэнсыянэр*; пенсия – *пэнсія*; план – *плян*.

***2. Тэрміналагічная лексіка іншамоўнага паходжання, пры перакладзе якой на беларускую мову ў слоўніку падаецца не адно слова, а некалькі.*** Пры гэтым на першым месцы ў беларускай частцы ў адных выпадках вынесена запазычанае слова: анкета – *анкета, апытальны ліст*; библиотека – *бібліотэка, кніжня*; билет – *білет, картка*; бюллетень – *бюлетэнь, абвесьнік*; гарантия – *гарантыя, забясьпека*; группа – *група, купа*; директор – *дырэктар, кіраўнік*; дисциплина – *дысцыпліна, парадак*; документ – *дакумэнт, папера*; журнал – *журнал, часопіс*; журналист – *журналіст, часапісец*; инструктировать – *інструктаваць, наказваць, даваць наказ*; инструкция – *інструкцыя, наказ*; кассир – *касір, скарбнік, касіер*; каталог – *каталёг, кнігасьпіс*; кодекс – *кодэкс, зборнік*; коллектив – *колектыў, суполка*; коллективный – *колектыўны, зборны*; контора – *кантора, бюро*; линия – *лінія, рыска*; у другіх – беларускае слова папярэднічае іншамоўнаму эквіваленту: адвокат – *правазаступнік, адвокат*; акция – *пай, акцыя*; биография – *жыцьцяпіс, біографія*; брошюра – *сшытак, брошура*; вакантный – *вольны, вакантны*; вариант – *адменьнік, варыянт*; консультация – *дарада, парада, консультацыя*; корреспондент – *дапісчык, корэспондэнт*; кредитор – *павернік, крэдытар, пазычальнік*; оригинал – *першатвор, арыгінал*; официальный – *службовы, афіцыяльны*.

У сучаснай беларускай мове для перадачы даследуемых намі іншамоўных слоў сродкамі беларускай мовы ў большасці выпадкаў захаваўся адзін варыянт – інтэрнацыянальнае слова, паколькі беларускі эквівалент не адпавядаў у поўным сэнсе аб'ёму абазначанага паняцця.

У асобных выпадках беларускія адпаведнікі ўжываюцца ў сучаснай беларускай мове, але ў іншым значэнні: билет – *картка*; брошюра – *сшытак*; вакантный – *вольны*; директор – *кіраўнік*; дисциплина – *парадак*; документ – *папера*; инструктировать – *наказваць, даваць наказ*; инструкция – *наказ*; кодекс – *зборнік*; коллективный – *зборны*; консультация – *дарада, парада*; контора – *бюро*; линия – *рыска*; оригинал – *першатвор*; официальный – *службовы*.

Адзінкавымі з'яўляюцца выпадкі, у якіх на сучасным этапе развіцця мовы захаваліся абодва адпаведнікі, якія існавалі і раней: журнал – *журнал, часопіс*; преобразование – *рэформа, launched ператварэньне*; результат – *вынік, рэзультат*.

***3. Тэрміналагічная лексіка іншамоўнага паходжання, якая перакладалася толькі беларускімі словамі.*** Адназначнага погляду на тэндэнцыю перакладу іншамоўных слоў не было. «Выказваліся думкі аб немэтазгоднасці і немагчымасці замены міжнародных тэрмінаў беларускімі словамі, якія часта не заключаюць у сабе дакладнага разумення пэўнага спецыфічнага паняцця» [1, с. 260]. На думку іншых, «пераклад іншамоўных слоў садзейнічаў іх лепшаму разуменню і засваенню народнымі масамі» [1, с. 260–261]. У пачатку XX ст. да некаторых тэрмінаў у якасці адпаведніка прыводзілася беларускае слова, але ў сучаснай беларускай мове яно замянілася на іншамоўнае, паколькі «ўтварэнне беларускай тэрміналогіі

з арыентацыяй толькі на жывую народную мову, як паказала практыка, не апраўдала сябе. Рэсурсы жывой беларускай мовы не змаглі даць патрэбныя найменні вялікай колькасці абстрактных паняццяў, якія шырокай плынню пачалі ўлівацца ў беларускую літаратурную мову першых паслякастрычніцкіх дзесяцігоддзяў» [1, с. 214–215]. Аб гэтым сведчаць наступныя словы: информация – *асьведамленьне*; информировать – *асьведамляць*; казначейство – *скарбовая каса, скарбніца*; классификация – падзел; корреспонденция – *допіс*; курьер – *пасланец*; легализация – *узаканеньне*; мотивировать – *абасноўваць*; орган – *установа*.

Такім чынам, можна адзначыць, што пры перакладзе тэрміналагічнай лексікі іншамоўнага паходжання сферы справаводства ў слоўніку С. Серады выкарыстоўваліся розныя эквіваленты: дыялектныя словы (вариант – *адменьнік*, кассир – *скарбнік*, процент – *адсотак*, юрисконсульт – *правper*радца), размоўна-гутарковыя (библиотека – *кніжня*, пресс-папье – *прыціскач*, юрист – *праўнік*), новаўтварэнні (биография – *жыцьцяпіс*, бюллетень – *абвесьнік*, каталог – *кнігасьпіс*, экземпляр – *паасобнік*), інтэрнацыянальная лексіка (адресат – *адрасат*, архив – *архіў*, виза – *віза*, календарь – *каляндар*, комиссия – *камісія*, копия – *копія*, параграф – *параграф*, резолюция – *рэзолюцыя*, текст – *тэкст*, телеграмма – *тэлеграма*), а таксама безэквівалентны, апісальны спосаб перакладу (нетрудоспособность – *няздольнасьць да працы*; обусловливать – *ставіць умовы*; телеграфировать – *падаць тэлеграму*; штаты – *расклад пасадаў*). У пачатку ХХ ст. у гэтым працэсе перавага аддавалася беларускім словам, часцей за ўсё вузкім дыялектызмам або штучным словам. Але такія словы не вытрымалі выпрабаванне часам. Калі ж такіх адпаведнікаў не было ў жывой народнай мове, укладальнікі слоўнікаў выкарыстоўвалі запазычанні з іншых моў або ўтваралі новыя словы. Сферу справаводства жывая народная мова не магла забяспечыць неабходным моўным матэрыялам, і таму пры адсутнасці адпаведнікаў утваралі неалагізмы. Але няўдалы пераклад іншамоўных тэрмінаў прыводзіў да падмены паняццяў, страты дакладнага значэння, асабліва ў заканадаўчай сферы, да ўтварэння тэрмінаў з празрыстай унутранай формай, што недапушчальна для тэрміналогіі, да зацямнення сэнсу і скажэння сутнасці. Таму працэс інтэрнацыяналізацыі навуковай тэрміналогіі выявіў вялікую ўстойлівасць.

Улічваючы ўсё вышэйсказанае, неабходна, аднак, адзначыць, што частка слоў у слоўніках пачатку ХХ ст., у тым ліку і ў слоўніку С. Серады, была перакладзена ўдала і замацавалася ў актыўным лексічным складзе сучаснай беларускай літаратурнай мовы (безответственность – *безадказнасць*; бесспорный – *бясспрэчны*; годовщина – *угодкі, гадавіна*; государственный – *дзяржаўны*; делопроизводитель – *справавод*; доверитель – *давернік*; должностной – *службовы*; заведующий – *загадчык*; личный – *асабісты, асабовы*; надзор – *нагляд*; обобщать – *абагульняць*; общий – *агульны, супольны*; отчет – *справаздача*; помощь – *дапамога, помач*; правительство – *урад*; правоспособный – *праваздольны*; председатель – *старшыня*; предшественник – *папярэднік*; сотрудничество – *супрацоўніцтва* і шмат іншых). Прычым многія з перакладзеных слоў у сучаснай беларускай мове не толькі захавалі, але і пашырылі сваё значэнне (у тэксце пазначаны курсівам): вывод – вывад, вынік, *вывядзенне*; выписка – выпіска, *выпісванне*; выплата – выплата, *выплачванне, выплат*; гражданский – грамадзянскі, *цывільны*; должность – пасада, *служба, абавязкі*; исключать – выключаць, *выводзіць, знімаць*; обращение – зварот, *пераварочванне, ператварэнне, схіленне, абарачэнне, абарот, абыходжанне, паводзіны, карыстанне, адозва, зваротак*; отпуск – адпачынак, *водпуск*; приложение – дадатак, *прыкладанне, прыкладванне, дастасаванне, дастасоўванне, дапасоўванне, прымяненне, прыдатак*; расписка – расьпіска, *распісванне, размалёўванне, размалёўка*; сообщать – паведамляць, *перадаваць, надаваць*; срок – тэрмін, *час*; устав – статут, *звычай, устаў*.

Такім чынам, можна сказаць, што ў пачатку XX ст. была праведзена вялікая работа па ўнармаванні беларускай літаратурнай мовы і стварэнні тэрміналагічнай сістэмы. А сёння мы можам адзначыць жыццяздольнасць тых ці іншых тэрмінаў і мэтазгоднасць гарманічнага развіцця тэрміналогіі з апораю на ўласныя рэсурсы пры спалучэнні з выкарыстаннем інтэрнацыянальнага матэрыялу.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Шакун, Л.М. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы : вучэб. дапам. для філал. фак. вну / Л.М. Шакун. – Мінск : Універсітэцкае, 1984. – 319 с.
2. Крамко, І.І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы : у 2 т. / І.І. Крамко, А.К. Юрэвіч, А.І. Яновіч ; пад рэд. А.І. Жураўскага. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – Т. 2. – 340 с.
3. Аніськова, С.М. Навукова-тэхнічная тэрміналогія: ля вытокаў станаўлення / С.М. Аніськова // Праблемы развіцця, функцыянавання і нармавання лексікі беларускай мовы: зб. навук. арт. міжнар. навук.-метад. канф., Гомель, 22–23 кастрычніка 2004 г. / Гомельскі дзярж. ун-т; рэдкал.: Д.Д. Паўлавец [і інш.]. – Гомель, 2004. – С. 3–5.
4. Бушлякоў, Ю. Нармалізацыя беларускай літартурнай мовы ў паслякастрычніцкі перыяд (да 1930 г.) / Ю. Бушлякоў // Известия ГГУ им. Ф. Скорины: Беларуская мова. – 2000. – № 2 (25). – С. 45–49.
5. Станкевіч, А.А. Зпазычванне лексікі іншамоўнага паходжання як адна з крыніц папаўнення тэхнічнай тэрмінасістэмы / А.А. Станкевіч // Праблемы развіцця, функцыянавання і нармавання лексікі беларускай мовы: зб. навук. арт. міжнар. навук.-метад. канф., Гомель, 22–23 кастрычніка 2004 г. / Гомел. дзярж. ун-т; рэдкал.: Д.Д. Паўлавец [і інш.]. – Гомель, 2004. – С. 67–71.
6. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне / Л.А. Антанюк. – Мінск. : Навука і тэхніка, 1987. – 240 с.
7. Серада, С. Дзелавод. Узоры афіцыяльных папер, слоўнік тэхнічна-канцэлярскіх выразаў і іншыя, патрэбныя ў дзелаводзтве веды / С. Серада; пад рэд. М. Красінскага. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. – 136 с.

***Belka L.G.* The Formation of Paper Work Terminology of the Belarusian Language at the Beginning of the XX Century (on the Basis of S. Sereda's «Delovod»)**

The article is dedicated to the problems of the history of development and formation of the paper work vocabulary. As the result of the research the author notices that translating terminological vocabulary of the paper work sphere different equivalents were used. They are: dialectical informal words, new word formation, international vocabulary and non-equivalent way of translating. The analyzed lexical material proves that the process of scientific terminology internationalization is very steady, as it is caused by the specific character of the words that have foreign origin.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 14.02.2011